На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадой...
Якуб Колас

№ 224 (346)
Аўторак, 16 снежня 1997 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА "Народная воля"
Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

Сонца

	Усход	Заход
Віцебск	8.20	15.30
Магілёў	8.11	15.37
Гомель	8.01	15.43
Мінск	8.22	15.48
Гродна	8.36	16.05
Брэст	8.28	16.14

Апошняя квадра 21 снежня.

Что там, на Витебщине?

Дареному коню…

Несладкая нынче жизнь у фермера-единоличника, в одиночку "строящего капитализм" в белорусской деревне: ни льготных кредитов, ни уважения колхозного начальства, ни реальной поддержки государства. На этом фоне мало-мальские признания фермерских заслуг — факт весьма отрадный. Нечто подобное случилось на Витебщине, когда областной Комитет по сельскому хозяйству и обеспечению населения продовольствием принял решение о награждении лучших фермеров области Виктора Богачева и Леонида Голенькова почетными грамотами комитета. Было бы неплохо фермерам получить что-нибудь посущественнее, да... И на том, как говорится, спасибо.

Не от хорошей жизни

На очередной аукцион по продаже объектов коммунальной собственности в Витебске впервые были выставлены... два кинотеатра. Ничего не поделаешь, денег от продажи билетов на киносеансы не хватает не то что на эксплуатацию и ремонт весьма солидных по возрасту зданий, но даже и на зарплату немногочисленному оставшемуся персоналу. Остается лишь вздыхать о временах, когда очереди за кинобилетами растягивались на многие метры от кинотеатров.

В гостях хорошо…

Сотрудники областной "вертикальной" газеты "Народное слова", побывавшие на юбилее губернской газеты "Тверская жизнь", удрученными покидали гостеприимный российский город. Вопреки широко распространенному мнению о том, что российская глубинка живет похуже белорусской, витебские журналисты были несколько шокированы увиденным.

Особенно поразила витеблян работа тверских коллег, уважение к газете со стороны самых высоких государственных структур, невзирая на очень часто острую критику властей. "Добил" гостей увиденный широкий жест "очень не любящего" "Тверскую жизнь" губернатора В.Платова, который направил журналистам поздравительную телеграмму и вексель на 150 миллионов рублей.

Как конфиденциально признался один из участников поездки, после всего увиденного в Твери очень уж трудно будет восхвалять нынешние "демократические преобразования" в Беларуси, что, собственно говоря, и требуется нынче от газетчиков.

Что имеем — не храним

Как и в старые добрые времена наибольшим спросом у иностранных коммерсантов пользуются наши предприятия, не производящие сами конкурентоспособную продукцию, а предпочитающие экспортировать остатки отечественных природных богатств. А потому успехом у иностранных предприятий неизменно пользуется продукция Суражского лесхоза. Круглый лес вывозят россияне, лиственный лес определенных параметров хорошо идет в Польшу. Пока есть что рубить, лесхоз не бедствует.

Евгений ТОМОВ.

Стоп-кадр



Зайздросце, мужчыны...

Фота Сяргея ФЁДАРАВА.

Позиция

Я не хочу возвращаться в храм неволи

Я — пенсионер. В прошлом — госслужащий. Имею только пенсию и старую однокомнатную квартиру. Ни к коммунистической, ни к нынешней власти личных претензий не имею. Но сказать все-таки хочу.

Сегодня слышен со всех сторон "плач Ярославны" по СССР. Но что это? Царская Россия была не всем своим сыновьям и дочерям родной матерью, но, вспомните, сколько лет в вооруженной борьбе "белые" защищали ее от большевиков.

А кто выступил в защиту СССР? Горстка не верящих в успех людей. Почему так произошло? Да потому, что нормальный человек не может защищать храм неволи, построенный на человеческих костях и окрашенный человеческой кровью.

Большевики, написав на своих знаменах библейские заповеди, построили настоящий храм неволи. В этом храме одни из нас были рабами по положению, другие — рабами по духу, и рабство последних — самая гнусная, самая мертвящая форма рабства. Но, к счастью, многие из нас, а может, и большинство, были только рабами по положению, и мы не хотим возвращаться в храм неволи — даже вместе с рабами по духу!

Виталий ЗАРЕЦКИЙ,
житель г.Витебска.

Беспредел

Юрий Ходыко принудительно доставлен в суд

12 декабря в 7.30 утра в квартире профессора Ю.В.Ходыко раздался звонок. Открыв дверь, хозяева увидели своего участкового А.Л.Тарасенко. Капитан милиции предъявил постановление судьи Центрального района г.Минска А.В.Борисенка о принудительном приводе в суд к 9.00 Юрия Ходыко.

Из предъявленного документа Юрий Владимирович узнал, что 3 декабря т.г. состоялся открытый судебный процесс, на котором рассмотрено предъявленное ему обвинение в нарушении 23 ноября 1997 года президентского декрета № 5 и, ввиду неявки обвиняемого, принято решение о принудительной доставке в суд.

Профессор сотруднику правопорядка подчинился и был препровожден в здание Фемиды. Юрий Владимирович заявил судье, что готов ответить перед законом, но в соответствии с Конституцией он имеет право на своего адвоката и свидетелей, которые отсутствовали по вине милиции и судейских клерков: ведь Советский РОВД получил постановление суда 8 декабря, однако каких-либо мер по предупреждению о судебном процессе Юрия Ходыко не предпринял. Секретарь суда также не приняла должных мер по оповещению участников процесса как 3, так и 12 декабря.

От предложенных судьей услуг дежурного адвоката Юрий Ходыко отказался ввиду отсутствия средств на оплату его труда. Он напомнил также служителю Фемиды, что опротестовал факт составления протокола в прокуратуру и пока еще не получил результатов рассмотрения своей жалобы. Возможна ведь и отмена прокуратурой предъявленного милицией обвинения.

Однако назначенный президентом специальный административный судья Анатолий Борисенок это ходатайство отклонил и назначил слушание дела на 10 утра в понедельник, 15 декабря 1997 года.

О результатах судебного разбирательства "Народная воля" читателям сообщит дополнительно.

Валерий ЩУКИН.

Знайте!

Как на Главпочтамте прячут от народа "Народную волю"

Не будем интриговать читателей. Тему главному редактору подсказал давний почитатель и подписчик "Народной воли", посетивший нас после своего визита на Главпочтампт. Там он из любопытства на привлекающем внимание стенде "Газеты Республики Беларусь " не обнаружил... своей любимой газеты.

Казалось, к тому, что нас госчиновники не пропагандируют, мы уже должны привыкнуть. О "Народной воле" вы не услышите по радио и в утренних обзорах газет, ее не станет восхвалять на телеэкране в "Рэзанансе" Зимовский... И тем не менее популярность газеты от этого невнимания еще более... растет. И в этом убеждал "поход" на главную почту столицы.

У окошка №6, где осуществляется и подписка, и выплата пенсий, и прием платежей за коммунальные услуги, очередь была немалой. Большинство людей тянулось к каталогу белорусских изданий.

— Подскажите, доченька, индекс "Народной воли", — спросил мужчина в летах Марину Дормаш. Та быстренько отыскала нужную страницу в каталоге на букву "Н". Я успел заметить, что возглавляет "Н"-ские подписантские ряды именно "Народная воля". За ней — "Народная газета", "Настаўніцкая газета". Против привычного индекса 63222 строки: "Ежедневная негосударственная газета. Рассказ о жизни республики, информирование читателей о событиях за рубежом".

Надобность задавать вопросы отпала. В каталоге газета есть, читатели могут свободно подписаться на свое издание.

Оставалось выяснить, по какой причине "Народная воля" не попала в перечень периодических изданий, предлагаемых главпочтой Минска. И вот я беседую с заместителем начальника отдела подписки "Белпочты" Тадеушем Михайловичем Коктышем.

— Из чего исходили? — переспросил Тадеуш Михайлович и, не уходя от острого вопроса, напрямую ответил: — Из популярности изданий...

Аргументы о популярности — это, думается, не более чем маскировка. Из 42 подписных изданий (отдельные газеты, как "Советская Белоруссия", "Рэспубліка" "Нацыянальная эканамічная газета", "Компьютерная газета" и другие, имеют по два индекса — для индивидуальной и ведомственной подписки) я насчитал более половины изданий, тираж которых намного скромнее тиража "Народной воли". Причина, видимо, в другом — в политической "бдительности" некоторых госчиновников. Знают же они, что из-за своей принципиальности, твердой, объективной позиции "Народная воля" не нравится власть предержащим. Вот и прячут всячески от народа "Народную волю". В "рекомендательном" списке "Белпочты" я не нашел также подписного индекса газеты "Имя".

Ничего у вас не получится, господа! На календаре — конец второго тысячелетия, а не средневековье.

Виктор СВИРКО.

Права человека

Власть может делать лишь только то, что ей разрешено законом, гражданин — все то, что законом не запрещено

Валерий ЩУКИН

На пресс-конференции, состоявшейся в Белорусском Хельсинкском комитете, журналистам приведены примеры агрессии государства против своих граждан. В БХК зарегистрировано более двух тысяч случаев преследования на Беларуси по политическим мотивам.

К узникам совести относятся граждане, преследуемые за свои политические и религиозные убеждения, не совершившие насильственных актов. В Республике Беларусь это те, на которых налагались аресты и штрафы по президентскому декрету №5 и будут налагаться по пришедшему ему на замену декрету №21.

На Беларуси преследование не ограничивается только арестом. Лица, содержащиеся под стражей, лишены элементарных бытовых удобств и медицинского обслуживания, им не разрешаются встречи с близкими, передачи с продуктами питания и теплой одеждой. Родственники не могут получить достоверную информацию о состоянии здоровья арестованных.

Все это является грубейшим нарушением Всеобщей декларации прав человека, действующей почти полвека. Права человека составляют сегодня основу мирового порядка. В конце XX века отношение к людям уже не является внутренним делом того или иного государства, в том числе и белорусского, в котором, по заявлению главы государства, преследований по политическим мотивам нет.

Мировое сообщество считает, что на Беларуси принцип разделения властей нарушен, поскольку судебная власть является придатком власти исполнительной, а законодательная власть, можно сказать, вообще отсутствует. Нет в республике и такого, принятого во многих странах мира, института, как уполномоченный по правам человека.

Вполне естественно, что, заслушав доклад белорусского правительства о соблюдении в республике прав человека, Организация Объединенных Наций выразила озабоченность об их ухудшении.

Слуханне справы аб ліквідацыі АТ "Рассвет" у гаспадарчым судзе Магілёўскай вобласці перанесена на 22 снежня

Пытанне аб далейшым існаванні акцыянернага таварыства "Рассвет", старшыня праўлення якога Васіль Старавойтаў, як вядома, знаходзіцца ў следчым ізалятары КДБ, пакуль застаецца адкрытым. Гэта высветлілася 11 снежня, пасля пасяджэння Гаспадарчага суда Магілёўскай вобласці, які адклаў слуханне справы аб ліквідацыі АТ на 22 снежня з-за няяўкі адказчыка.

Як паведамілі прадстаўнікі АТ "Рассвет", гаспадарка яшчэ не падрыхтавалася да суда і загадзя паслала хадайніцтва аб пераносе слухання па справе, аднак па невядомых прычынах да суддзі яно не дайшло. Сход акцыянераў АТ "Рассвет" па пытанні аб ліквідацыі таварыства яшчэ не праводзіўся.

Аляксандр АЛЕКСАНДРОВІЧ,
БелаПАН.

Група былых дэпутатаў Вярхоўнага Савета 12-га склікання звярнулася з адкрытым лістом да прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі хакея на лёдзе Рэнэ Фазеля

Група былых дэпутатаў Вярхоўнага Савета Беларусі 12-га склікання — Лявон Баршчэўскі, Сяргей Папкоў, Юрый Беленькі, Барыс Гюнтэр — звярнулася з адкрытым лістом да прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі хакея на лёдзе Рэнэ Фазеля. Экс-парламентарыі звяртаюць яго ўвагу на абранне Юрыя Бародзіча, начальніка Службы аховы прэзідэнта Беларусі, прэзідэнтам Федэрацыі хакея Беларусі.

Экс-дэпутаты нагадваюць, што Юрый Бародзіч быў адным з тых, хто 12 красавіка 1995 года кіраваў збіццём апазіцыйных дэпутатаў, якія праводзілі галадоўку ў зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. "Адной з груп узброеных людзей кіраваў непасрэдна шэф Службы аховы прэзідэнта Беларусі Юрый Бародзіч, — гаворыцца ў лісце. — Па яго загаду дэпутаты былі жорстка збіты дубінкамі і нагамі, а потым выкінуты з будынка парламента.

Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь Васіль Шаладонаў узбудзіў па гэтым выпадку крымінальную справу, па якой Юрый Бародзіч праходзіў у якасці аднаго з падазроных. Аднак праз некаторы час прэзідэнт Лукашэнка антыканстытуцыйным спосабам зняў пракурора з пасады. Расследаванне, падчас якога факт грубых дзеянняў прэзідэнцкіх ахоўнікаў у дачыненні да маючых імунітэт дэпутатаў быў засведчаны, таксама было прыпынена". У лісце прыводзяцца і іншыя факты "злачынных дзеянняў" Службы аховы прэзідэнта супраць грамадзян Беларусі, журналістаў, дэпутатаў Вярхоўнага Савета 13-га склікання. Аўтары ліста просяць прэзідэнта МФХ праінфармаваць членаў савета Федэрацыі хакея аб гэтым пасланні і звесці да мінімуму кантакты са спадаром Бародзічам як прадстаўніком Федэрацыі хакея Беларусі. "Іншы спосаб дзеянняў быў бы знявагай для тысячаў ахвяр беларускага дыктатарскага рэжыму", — гаворыцца ў лісце.

Генадзь БАРБАРЫЧ, БелаПАН.

Ходят слухи...

От Палаты останутся рожки да ножки

Похоже, что уже вскоре от Палаты представителей Национального собрания останутся, как в известной сказке, рожки да ножки. Неуверенные в том, что этот так называемый законодательный орган просуществует достаточно долго, "палаточники" под любым предлогом покидают карманный парламент.

Как известно, недавно президент А.Лукашенко назначил члена нижней палаты Владимира Григорьева послом Республики Беларусь в Российской Федерации. На освободившееся "хлебное" место, поговаривают, претендует еще один верноподанный "палаточник" — Анатолий Красуцкий. Что касается председателя комиссии по законодательству Юрия Малумова, то он ждет не дождется, когда последует президентский указ о его перемещении в Москву в качестве заместителя вице-премьера и представителя президента Беларуси в Российской Федерации Василия Долголева.

Председатель международной комиссии Палаты представителей Леонид Рачков, поработав в этой должности всего год, похоже, решил, что он уже созрел для дипломатической карьеры. Рассказывают, что господину Рачкову очень понравилось, когда в Тегеране его возили на шестисотом "Мердесе". Теперь, ходят слухи, он не прочь испытать и автомобильный парк Японии, изъявляя желание поработать в посольстве Республики Беларусь в Токио. Даже в качестве советника. А послом, как утверждают некоторые издания, туда, как ни странно, стремится Петр Кравченко, который еще недавно доказывал всему миру нелегитимность прошлогоднего референдума и созданных на его основе палат. Впрочем, известно, что Леонид Рачков более-менее сносно владеет форси. Поэтому разумно было бы отправить его в Исламскую Республику Иран. Там, правда, сейчас нет белорусского дипломатического представительства. Но оно вполне может быть там открыто, особенно если учесть восточный фактор белорусской внешней политики.

Еще одному председателю комиссии Палаты представителей — Юрию Кулаковскому, видимо, придется переместиться из столицы в провинцию. Говорят, что этот активный парламентарий чем-то был связан с ныне опальным дважды Героем Социалистического Труда Василием Старовойтовым и президент уже решил отправить Ю.Кулаковского назад, в Кировск, главой местной вертикали: мол, ты там раньше был заместителем председателя райисполкома — так и наводи порядок...

И последнее, о чем поговаривают в политических кулуарах, — это переход из законодательной в исполнительную еще одного председателя комиссии Станислава Говорушкина. Он якобы займет пост министра здравоохранения республики. А нынешний министр Игорь Зеленкевич вроде тоже уедет на работу в столицу Российской Федерации.

Не останутся ли и в самом деле от Палаты рожки да ножки...

Владимир ГЛОД.

Пракуратура Савецкага раёна Мінска спыніла крымінальную справу ў дачыненні да дэпутата Вярхоўнага Савета 13-га склікання Валерыя Шчукіна

Пракуратура Савецкага раёна Мінска спыніла крымінальную справу ў дачыненні да дэпутата Вярхоўнага Савета 13-га склікання Валерыя Шчукіна.

Як ужо паведамляў БелаПАН, справа была ўзбуджана 26 кастрычніка гэтага года па прыкметах злачынства, прадугледжаных артыкулам 188 Крымінальнага кодэкса, — "знявага прадстаўніка ўлады". Дэпутата, у прыватнасці, абвінавачвалі за рэзкія выказванні ў адрас прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, якія ён дапусціў на мітынгу салідарнасці з журналістамі ГРТ 30 жніўня. Зараз разглядаецца пытанне аб прыцягненні В.Шчукіна да адказнасці па артыкуле 156[3] Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях — "знявага". Ён прадугледжвае пакаранне ў выглядзе штрафу, у той час як па вышэйназваным артыкуле Крымінальнага кодэкса Шчукін мог быць пакараны, акрамя штрафу, да аднаго года папраўчых прац.

Генадзь БАРБАРЫЧ,
БелаПАН.

Брэсцкі аблвыканкам зацвердзіў пералік гістарычных аб'ектаў, якія маюць патрэбу ў першачарговай рэстаўрацыі

Каардынацыйны савет па ахове спадчыны Брэсцкага аблвыканкама зацвердзіў пералік гістарычных аб'ектаў вобласці, якія маюць патрэбу ў першачарговай рэстаўрацыі і грунтоўным абследаванні на перыяд да 2005 года.

Аб'ектамі, якія маюць патрэбу ў рэстаўрацыі, прызнаны мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць", гарнізонная царква на яе тэрыторыі, 15 аб'ектаў цэнтра гістарычнай забудовы Брэста, палац Бутрымовічаў у Пінску, палацава-паркавыя ансамблі ў вёсках Тугановічы і Ястрэмбель Баранавіцкага раёна, сінагога ў в.Пагост-Загародск Пінскага раёна і іншыя аб'екты — усяго звыш 50 помнікаў архітэктуры, гісторыі і культуры. Акрамя гэтага, павінна быць праведзена комплекснае і грунтоўнае абследаванне гісторыка-культурнай спадчыны вобласці з мэтай выяўлення няўлічаных гістарычных і архітэктурных аб'ектаў. Мяркуецца, што фінансаванне работ будзе праводзіцца з мясцовых, абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў, а таксама за кошт спонсараў.

Валянціна КАЗЛОВІЧ, БелаПАН.

Крэдыторская запазычанасць у калгасах і саўгасах Беларусі ў пяць разоў перавышае дэбіторскую

Крэдыторская запазычанасць у калгасах і саўгасах Беларусі перавышае дэбіторскую прыкладна ў пяць разоў — такія даныя паведаміў журналістам міністр сельскай гаспадаркі і харчавання рэспублікі Іван Шакола.

Па яго словах, фінансавая сітуацыя ў сельскіх гаспадарках даволі складаная, што абцяжарвае падрыхтоўку да вясенне-палявых работ. У сувязі з гэтым, паведаміў міністр, Саветам міністраў была прынята пастанова аб фінансаванні вясенне-палявых работ, згодна з якой вёсцы будзе выдзелена каля 3 трыльёнаў рублёў з пазабюджэтнага фонду падтрымкі.

У першым паўгоддзі 1998 года сельскім гаспадаркам таксама будзе выплачана каля 6 трыльёнаў рублёў розных авансаў пад дзяржаўны заказ. Акрамя таго, па словах І.Шаколы, каля 3 трыльёнаў рублёў крэдытаў пад закупку неабходных запчастак, тэхнікі і сродкаў абароны павінны выдзеліць Нацыянальны і камерцыйныя банкі рэспублікі. Усё гэта, лічыць міністр, крыху палепшыць фінансавую сітуацыю ў калгасах, саўгасах і дазволіць паспяхова падрыхтавацца да правядзення вясенне-палявых работ.

Аляксей АРЭШКА,
БелаПАН.

Спорт

У дзесятцы лепшых біятланістак — Святлана Парамыгіна

Лідэр беларускіх біятланістак Святлана Парамыгіна цяпер у добрай спартыўнай форме. Сведчаннем таго можа служыць другі этап Кубка свету, які адбыўся ў шведскім горадзе Эстэрсунд. На гэты раз у жаночай праграме спаборніцтваў была класічная гонка са стральбой на 15 кіламетраў.

Улічваючы перадалімпійскі характар гэтага розыгрышу кубка, на трасу выйшлі ўсе мацнейшыя біятланісткі, якія прэтэндуюць на высокія месцы ў японскім Нагана. І хоць у кожнай спартсменкі тут былі свае задачы, заліковыя ачкі нікому не перашкаджалі. Святлана, відаць, улічыўшы няўдачную стральбу на першым этапе ў Лілехамеры, цяпер на агнявым рубяжы была вельмі дакладнай. Праўда, яна дапусціла адзін промах, як і пераможца са Славеніі Андрэа Грашыч (45 мін. 32,7 сек.), аднак на лыжні мінчанка значна ўступіла ёй у хуткасці і заняла восьмае месца, што даволі нядрэнна для пачатку сезона.

Сярод мужчын у гонцы на 20 км са стральбой на чатырох рубяжах першынстваваў нарвежац Сільфест Глімсдаль, які паказаў вынік 49 мін. 19,0 сек. (1 промах). З беларускіх страляючых лыжнікаў у заліковы лік ніхто не трапіў.

Яшчэ біятланістаў чакаюць спаборніцтвы на спрынтэрскіх дыстанцыях і ў эстафетных гонках.

Вячаслаў ДУТАЎ,
БелТА.

Падпіска на "Народную волю" працягнута да 20 снежня

Запаўняйце, калі ласка, падпісны бланк — і на пошту альбо ў любы падпісны пункт.

Не хочаце адстаць ад жыцця — чытайце "Народную волю".

Мы не служым уладзе.
Мы не служым партыям.
Мы служым праўдзе.

Вы — з "Народнай воляй"!
"Народная воля" — з Вамі!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **63222** (індэкс выдання)

Народная Воля

Колькасць камплектаў ___

на 1998 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ________ (паштовы індэкс) ________ (адрас)

Каму ________ (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету **63222** (індэкс выдання)

ПВ	месца	літар

Народная Воля

Кошт	падпіскі	____ руб.	Колькасць камплектаў	
	пераадрасоўкі	____ руб.		

на 1998 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ________ (паштовы індэкс) ________ (адрас)

Каму ________ (прозвішча, ініцыялы)

Станислав БОГДАНКЕВИЧ, депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва, председатель Объединенной гражданской партии

Синдром колебаний, нерешительности и соглашательства дорого обходится Беларуси

Мы, большая группа депутатов Верховного Совета 13-го созыва, правомерно гордимся тем фактом, что в условиях установившегося в стране произвола и беззакония нашли в себе мужество сохранить собственное достоинство и честь, продолжать отстаивать интересы избравшего нас населения, защищать Конституцию, права и свободы граждан, суверенитет и независимость Беларуси. В то же время Верховный Совет 13-го созыва не сумел стать серьезной для правящего режима оппозицией, под знамена которой встали бы широкие слои демократической общественности. По выражению А.Лукашенко, такую оппозицию надо беречь, ибо она создает в обществе иллюзию свободы и демократии и не опасна для режима. По-крупному нам мало что удалось в плане решения главной задачи — завоевания в народе бесспорного авторитета, восстановления народовластия и Конституции 1994 г., распространения правдивой информации, предоставления общественности альтернативы действующему режиму в национальных лидеров, готовых бороться за широкую общественную поддержку.

Сегодня Верховный Совет реально представляет собой лишь **символ сопротивления диктатуре**, а не координационный центр, объединяющий и направляющий все оппозиционные авторитарному режиму силы. Несмотря на полученный горький опыт поражения, часть нашего руководства все еще не преодолела синдром колебаний, нерешительности и соглашательства, что дорого стоило стране в прошлом. Оно не только не инициировало, но, наоборот, немало сил и энергии тратило на торпедирование тех немногих инициатив, которые родились в наших недрах и были направлены на активизацию борьбы с режимом.

Вспомним, в каких трудных условиях рождался Национальный экономический совет, предложенный стать в коалиционный орган демократической оппозиции существующему режиму — в созданный ведущими партиями под эгидой Верховного Совета коалиционный Национальный исполнительный комитет. Или сколько усилий было затрачено при создании специальной комиссии по правовой оценке нарушений А.Лукашенко Конституции и законов страны, а затем при принятии Политического заявления по результатам проведенного расследования, суть которого состоит в возобновлении процесса импичмента А.Лукашенко. Правда, к чести руководства Верховного Совета и его депутатов, в конечном итоге все важные решения были единодушно поддержаны. Однако с немалыми трудностями столкнулась и наша новая инициатива, озвученная депутатом Владимиром Нистюком еще в январе сего года, об исключении из Верховного Совета тех депутатов, которые **сами сложили с себя депутатские полномочия**, дав согласие на назначение, по согласованию с президентом, в так называемую Палату представителей, что несовместимо, согласно Конституции, с полномочиями депутата Верховного Совета Республики Беларусь. Цель этой инициативы — обрести полномочия для принятия законных решений и кворум, возобновить правомочные де-юре заседания Верховного Совета. Может быть, правы те, кто утверждает, что для отдельных из нас важнейшей личной задачей является удержание на политическом плаву, а не активная борьба с узурпаторским режимом. Проведенные нами встречи со многими депутатами Верховного Совета, приостановившими участие в неправомочных депутатских собраниях, но отказавшимися от членства в президентской Палате представителей, свидетельствуют об их желании участвовать в работе правомочного [illegible]

Если судить по письменным ответам на вопросы, заданные "Народной волей" депутатам и членам руководства Верховного Совета, ни у кого, кроме г-на Калкина, нет сомнений относительно юридических оснований для оформления бесспорного факта сложения членами Палаты представителей депутатского статуса Верховного Совета.

Например (цитирую), С. Шарецкий: "У меня нет **ни малейших сомнений** в наличии законодательных оснований для признания недействительными мандатов президентских назначенцев из палаты"; С.Шушкевич: "Я считаю, что юридических оснований в точной и ясной форме достаточно..."; В.Новиков: "...у Верховного Совета просто нет иного выхода. Нет для себя миссию (т.е. обрести полномочия и кворум. — **Авт.**), вопрос о лишении полномочий депутатов Верховного Совета четко прописан в Конституции и соответствующих законах"; В.Нистюк: "Основания есть, и бесспорные. Главное из них конституционное — не может быть депутатом Верховного Совета лицо, назначенное на должность президентом или по согласованию с ним".

Однако дальше у отдельных депутатов вновь колебания, поиски частных политических, но юридических лазеек, которые, при желании, всегда можно найти, учитывая **нестабильность, абсурдность, неординарность, уникальность той ситуации**, в которой находится наше общество, для оправдания своей собственной слабой позиции. Некоторые говорят о преимуществах, которые будто бы дает нам неправомочное положение Верховного Совета, видимо, для сохранения собственного политического лица, другие (С.Шарецкий) — какую часть населения будем представлять и где возьмем средства, третьи (В.Нистюк) — не время, мало, только лишь один год думали, надо еще пару лет подумать, третьи — а что скажет Марья Ивановна на Западе, а что — на Востоке. Однако у большинства депутатов имеется твердая позиция. Например, депутат В.Новиков так сформулировал ответ на часто задаваемый вопрос "Для чего это нужно?", с которым я полностью солидарен: "...возобновление деятельности Верховного Совета **в значительной степени будет способствовать** тому, чтобы вернуть Беларусь на конституционный, правовой путь, чтобы с меньшими издержками и в более короткие сроки преодолеть этот непомерно затянувшийся кризис. **Альтернативы этому просто нет**..." Верные слова. К этому я бы добавил, что народ Беларуси вправе иметь правомочный парламент, который хоть бы де-юре контролировал исполнительную власть, защищал Конституцию, имел возможность принять необходимые законопроекты, прежде всего связанные с продолжением процесса импичмента А.Лукашенко. Вспомним хотя бы тот факт, что на прошлом своем заседании мы не приняли по заключению специальной комиссии В.Гончара имеющего законную силу постановления, а ограничились декларацией в форме Политического заявления из-за искусственного отсутствия кворума, вызванного нерешенностью вопроса о правомочном составе Верховного Совета Республики Беларусь. Важно, наконец, и то, что Верховный Совет, продемонстрировав национальной и международной общественности свою активность и жизнеспособность, заявит о полном восстановлении своей деятельности в качестве высшего представительного и единственного де-юре законодательного органа страны. Кроме того, мы исключим даже теоретическую возможность того, что после будущей отставки президента власть не достанется восстановленному Верховному Совету, где большинство будет принадлежать связанной круговой порукой общего предательства группе во главе с А.Малофеевым. В соответствии с Конституцией, после отставки (импичмента) президента власть должна перейти к правомочному парламенту и его председателю. При этом само собой разумеется, что, как только верховенство Конституции в стране будет восстановлено, Верховный Совет объявит довыборы депутатов по непредставленным избирательным округам или, при необходимости, перевыборы всего состава Верховного Совета, а также выборы нового президента.

Помимо этого, Верховный Совет в течение года после избрания на ноябрьских (1996 г.) выборах не удосужился признать полномочия четырех новых депутатов, победивших в острой конкуренции с соперниками. Они имеют полное конституционное право представлять интересы избравшего их населения и быть включенными в полномочный депутатский кворум. Давно пора нам создать для этого новую мандатную комиссию и поручить ей рассмотреть этот вопрос, руководствуясь при этом не столько процедурными положениями, которые в условиях чрезвычайного положения невозможно соблюсти, а Основным Законом страны и достоверными, хотя и неофициально полученными от узурпированной президентом Центральной избирательной комиссии данными. И здесь кое-кому мелкие частные процедуры кажутся важнее конституционных норм и здравого смысла.

Итак, правомочный Верховный Совет необходим для подготовки неотложных законопроектов, для доведения процесса импичмента А.Лукашенко до логического конца, для формирования переходного правительства национального единства, для гарантирования народу конституционного права на полную и достоверную информацию, для восстановления народовластия, то есть организации и проведения выборов либо перевыборов в Верховный Совет и выборов нового президента. Полномочный Верховный Совет также нужен как орган, под крышей которого функционировал бы признанный цивилизованным миром национальный исполнительный комитет, создаваемый ведущими оппозиционными диктаторскому режиму партиями и общественными объединениями для организации конкретных согласованных акций, направленных на восстановление в стране конституционной законности.

Уважаемые депутаты! Разумеется, все депутаты были избраны народом и **никто не вправе лишить их полномочий**. Верховный Совет должен строго следовать конституционным нормам. В строгом соответствии с Конституцией, он не только вправе, но и обязан зафиксировать добровольный отказ от депутатских полномочий в Верховном Совете тех из них, которые при переходе из Верховного Совета в Палату представителей и по согласованию с президентом были туда зачислены, а также в нарушение Конституции совместно с президентом распустили Верховный Совет, узурпировав дефакто в руках президента и Палаты представителей реальную законодательную власть. Это процедурный вопрос, и для принятия такого решения достаточно простого большинства от участвующих в заседании депутатов. Однако хотелось бы, чтобы все депутаты в этих экстремальных, не предвиденных никакими законами условиях проявили должное гражданское мужество и твердость духа, не уклонялись от ответственности и естественного в условиях диктаторского произвола риска, единодушно поддержали внесенный проект постановления. Что касается фракции "Гражданское действие", то большинство ее членов высказывается за участие в дальнейшем в работе лишь Верховного Совета, имеющего де-факто соответствующие полномочия и кворум, и не видит смысла участвовать в неправомочных (де-юре) собраниях ("тусовках").

Примечание. Несмотря на отсутствие сомнений в части юридических оснований для исключения из Верховного Совета по собственному желанию депутатов, перешедших в президентскую Палату представителей, председатель Верховного Совета Республики Беларусь г-н С.Г.Шарецкий, его первый заместитель — секретарь ЦК ПКБ г-н В.Н.Новиков, а также депутат — секретарь ЦК СДП "Народная Грамада" В.П.Нистюк вместе со своими коллегами по партиям голосовали, вопреки Основному Закону и здравому смыслу, за сохранение за палатниками депутатских полномочий в Верховном Совете, тем самым не допустив его восстановления в качестве полностью правомочного единственного законодательного органа страны.

Вышэйшы гаспадарчы суд рэспублікі спыніў выданне газеты "Свабода"

Калектыў рэдакцыі падрыхтаваў апеляцыю на перагляд справы. Сёння апальныя журналісты прапануюць чытачам "Народнай волі" чарговую падборку

Падтрымка з берагоў Дуная

Пісьменнікі і журналісты Славакіі таксама абураныя фактам закрыцця "Свабоды"

Славацкі PEN-цэнтр рашуча пратэстуе супраць жорсткага ўчынку лукашэнкаўскай Адміністрацыі. "Мы выказваем сваю падтрымку як супрацоўнікам "Свабоды", так і іншым незалежным журналістам, якія не баяцца выказваць свае меркаванні, нягледзячы на ўціск і абвінавачванні", — гаворыцца ў заяве, якую падпісаў старшыня славацкага PEN-цэнтра Л.Грэндэль.

Расціслаў ПЕРМЯКОЎ.

Прэзідэнт піша прэзідэнту

Прэзідэнт Сусветнай асацыяцыі газет, якая аб'ядноўвае 15.000 выданняў у больш чым 100 краінах, Джэйм Сіроцкі звярнуўся да беларускага прэзідэнта з лістом пратэсту супраць закрыцця газеты "Свабода".

Джэйм Сіроцкі нагадвае Лукашэнку, што закрыццё "Свабоды" за тое, што яна даносіла чытачам інфармацыю, — гэта яўнае парушэнне міжнародных пагадненняў, якія гарантуюць свабоду выказвання і распаўсюджвання думак. "Прымусіўшы замоўкнуць адну з нямногіх незалежных крыніцаў інфармацыі ў Беларусі, беларускія ўлады парушылі міжнародныя ўрадавыя абавязацельствы аб далучэнні да Хельсінкскіх пагадненняў і да дэкларацыі ААН па правах чалавека", — гаворыцца ў лісце. Сусветная асацыяцыя газет патрабуе ад беларускіх уладаў аднавіць выпуск газеты "Свабода" і больш не ствараць для яе перашкодаў у зборы і распаўсюджванні інфармацыі.

Вячаслаў КЕБІЧ:

"Я цярпеў "Свабоду". Такая газета патрэбна"

"Тыя, хто закрыў газету "Свабода", залезлі і да мяне ў кішэню, бо я з'яўляюся падпісчыкам "Свабоды" на працягу ўжо некалькіх гадоў", — заявіў Вячаслаў Кебіч.

У размове з карэспандэнтам "Свабоды" былы прэм'ер-міністр выказаў шкадаванне з нагоды рэпрэсій супраць незалежнага друку і паспачуваў калектыву рэдакцыі. "Калі я быў прэм'ерам, ваша газета вяла са мной сапраўдную барацьбу, але я цярпеў, — узгадаў Вячаслаў Кебіч і прызнаў, што за час пасля ягонай адстаўкі "Свабода" стала яшчэ цікавейшай і больш карыснай. Ён упэўнены: — Трэба, каб існавала газета, якая прымушае ўлады варушыцца".

Былы прэм'ер упэўнены, што закрыццём газеты ўлады знізяць свой рэйтынг і аўтарытэт, хоць і нанясуць шкоду апазіцыі. "Ад закрыцця "Свабоды" мы ўсе страцім", — лічыць Вячаслаў Кебіч і выказвае надзею, што газета ўсё ж адновіць выхад.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ.

ЗША заклікаюць беларускія ўлады адмяніць рашэнне аб закрыцці газеты "Свабода"

Прэс-сакратар Дзярждэпартамента ЗША Джэймс Рубін выступіў з заявай ад імя амерыканскай дзяржавы. Урад Злучаных Штатаў пратэстуе супраць ціску, які беларускія ўлады аказваюць на незалежныя сродкі масавай інфармацыі.

Прыводзім поўны тэкст заявы Дзярждэпартамента ЗША:

"24 лістапада пасля 15 хвілінаў абмеркавання суд у Мінску забараніў беларускую незалежную газету "Свабода". Улады сцвярджаюць, што апублікаваныя гэтай газетай артыкулы, у якіх сённяшні палітычны клімат на Беларусі параўноўваецца з сталінскімі рэпрэсіямі 1937 года і абмяркоўваюцца намаганні апазіцыі аб'явіць імпічмент прэзідэнту Лукашэнку, распальваюць сацыяльную варожасць і такім чынам парушаюць закон аб друку. Судовае рашэнне ўступіла ў сілу з моманту прыняцця. У выдаўцоў "Свабоды" ёсць адзін месяц для таго, каб аспрэчыць гэтае рашэнне, але калі выйдзе яшчэ хоць адзін нумар "Свабоды", то выдаўцы могуць быць арыштаваныя.

Закрыццё "Свабоды" — гэта чарговы крок з цэлага шэрагу дзеянняў, накіраваных на падаўленне свабоды слова і прэсы ў Беларусі. На незалежныя выданні ўлады насылаюць шматлікія інспекцыі і пагражаюць газетам судовай расправай. Журналістаў штрафуюць, збіваюць, высылаюць з Беларусі, кідаюць за краты, часам — на некалькі месяцаў. Свабода слова і прэсы — гэта фундаментальныя правы чалавека. Яны запісаныя ў абавязацельствах, якія Беларусь добраахвотна прыняла на сябе пры ўваходжанні ў Арганізацыю па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ). Закрыццё "Свабоды" — яшчэ адзін учынак беларускіх уладаў, які вядзе да самаізаляцыі краіны, гэты крок яшчэ аддаляе Беларусь ад паўнацэнных канструктыўных адносінаў, якія Мінск, мяркуючы па афіцыйных заявах, хоча мець з міжнароднай супольнасцю.

Злучаныя Штаты заклікаюць беларускія ўлады спыніць пераслед незалежных сродкаў масавай інфармацыі, а таксама настойваюць, каб на Беларусі ў поўнай ступені паважаліся свабода слова і свабода прэсы. У якасці першага кроку ім належыць адмяніць рашэнне аб закрыцці газеты "Свабода"".

Погляд з Польшчы

Гэтаксама як гарачка гаворыць аб хваробе чалавека, так закрыццё апазіцыйнай прэсы гаворыць аб хваробе дзяржавы. У Беларусі, дзе суд за 15 хвілін прыняў рашэнне аб закрыцці апазіцыйнай газеты "Свабода", адбываецца нешта нядобрае. Дзеянні беларускіх уладаў заслугоўваюць адназначна негатыўнай ацэнкі, і трэба гаварыць аб гэтай справе на ўвесь голас дзеля дэманстрацыі суседскай і журналісцкай салідарнасці.

Суседства з Беларуссю зусім не простае: яе прэзідэнт, хаця і не прытрымліваецца прызнаных у Еўропе норм дэмакратыі, карыстаецца, аднак, падтрымкай большасці выбаршчыкаў, і цяжка казаць аб недэмакратычнасці яго абрання на прэзідэнцкую пасаду. Прэзідэнт Лукашэнка з'яўляецца вынаходнікам дэмакратыі без свабоды. Аднак польская знешняя палітыка не можа кіравацца прынцыпам "Няхай сабе жывуць як хочуць, гэта не нашая праблема". Дэмакратычныя сілы ў Польшчы, партыі, прафсаюзы павінны знайсці спосаб і сродкі, каб трымаць пастаянны кантакт з тымі грамадскімі сіламі ў Беларусі, у якіх бачаць надзею на дэмакратычную эвалюцыю нашага суседа.

Часопіс "Палітыка" (Польшча).

На мяжы ўведзены "паліткантроль"

Прадстаўніку "Хартыі-97" Віктару Івашкевічу не дазволілі вывезці з Беларусі матэрыялы аб парушэнні правоў чалавека ў нашай краіне.

Гэта здарылася 9 снежня на мяжы ў Брэсце. Віктар Івашкевіч разам з выдаўцом газеты "Свабода" Паўлам Жуком кіраваліся цягніком з Мінска ў Варшаву, дзе ў іх была запланаваная прэс-канферэнцыя. Перш чым выпусціць "харцістаў" за мяжу, беларускія мытнікі грунтоўна іх абшукалі і забралі ўсе "крамольныя" паперы. У Віктара Івашкевіча было канфіскавана 12 экземпляраў "Праваабаронча агляду", 42 старонкі "Хронікі парушэння правоў чалавека ў Беларусі", адзін экземпляр "Маніторынгу канфліктаў у РБ", а таксама 22 фотаздымкі, на якіх быў адлюстраваны разгон дэманстрацыяў у Мінску. Старшы інспектар Брэсцкай мытні В.Дубовік, які кіраваў канфіскацыяй, заявіў Івашкевічу, што на мяжы ўведзены "паліткантроль" і вываз падобных матэрыялаў цяпер не дазваляецца.

Мікола ГРЫНЯВІЦКІ.

У міністэрствах складаюць спісы сакрэтнай інфармацыі?

У нетрах беларускага ўрада распрацоўваецца афіцыйны спіс звестак, якія падлягаюць засакрэчванню. Сачыць за тым, каб яны не траплялі ў сродкі масавай інфармацыі, будзе адпаведнае ўпраўленне.

Як сцвярджае першы намеснік старшыні Дзяржкамдруку Зіновій Прыгодзіч у лісце да прэм'ер-міністра Сяргея Лінга, у прэсе "выяўлена звыш 40 фактаў, якія падпадаюць пад прыкметы дзяржсакрэтаў". У якасці прыкладу прыводзіцца схема водазабеспячэння Мінска, якую апублікавала "Белорусская деловая газета". Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі лічыць, што гэтая схема без геадэзічнай прывязкі да мясцовасці не з'яўляецца сакрэтам. Аднак, па словах Прыгодзіча, "шэраг кампетэнтных крыніцаў" упэўнены ў тым, што мела месца абнародаванне дзяржаўнай таямніцы. Прыгодзіч звяртае ўвагу і на газету "Свободные новости", якая "назвала канкрэтны адрас сховішча залатога запасу рэспублікі і паспрабавала раскрыць сістэму яго аховы". Міністэрства фінансаў прамаўчала, а вось Нацыянальны банк, па словах Прыгодзіча, лічыць "нават перапіску па гэтым пытанні канфідэнцыйнай, якая павінна мець грыф сакрэтнасці. Прыгодзіч скардзіцца Лінгу, што міністэрствы праяўляюць "благадушша, бяспечнасць і нігілізм", таму прымяніць карныя санкцыі да газет немагчыма. У выніку, маўляў, паток службовай інфармацыі трапляе за мяжу, што "наносіць урон дзяржаўнасці".

Увогуле, пералік сакрэтнай інфармацыі існуе, але ў Дзяржкамітэце па друку лічаць яго недастатковым. Таму Прыгодзіч прапанаваў прэм'ер-міністру Лінгу даць распараджэнне "міністэрствам і іншым органам дзяржаўнага кіравання", каб яны правялі "дэталёвую распрацоўку ведамасных пералікаў звестак, што падлягаюць засакрэчванню". Прэм'ер Лінг даў такое распараджэнне.

Як паведаміў карэспандэнту газеты "Свабода" начальнік упраўлення кантролю за выкананнем заканадаўства Дзяржкамдруку, новы пералік сакрэтнай інфармацыі — рэч "гістарычна неабходная". Па сутнасці, у Беларусі вяртаецца з небыцця так званы Галоўліт, які ў савецкія часы выконваў непасрэдныя функцыі цэнзуры. Да таго ж, гэтыя "сакрэты" даюць уладам яшчэ адну магчымасць ціску на сродкі масавай інфармацыі. Прыгодзіч адназначна піша, што ў падобных выпадках "Дзяржаўны камітэт па друку мае ўсе падставы аб'явіць... афіцыйнае папярэджанне або прымяніць іншыя санкцыі".

Алесь ДАШЧЫНСКІ.

Пра Лукашэнку — толькі з вялікай літары

Адміністрацыя прэзідэнта Лукашэнкі занялася праблемамі правапісу.

Чыноўнікі вырашылі, што, называючы Аляксандра Лукашэнку "кіраўніком дзяржавы", слова "кіраўнік" трэба пісаць з вялікай літары. У газеце "Советская Белоруссия" гэтая норма ўжо дзейнічае з 6 снежня. Карэктары "СБ" мусяць сачыць, каб з вялікай літары пісалася не толькі слова "прэзідэнт", але і першае слова ў спалучэнні "кіраўнік дзяржавы". У астатніх афіцыйных газетах слова "кіраўнік" пішуць пакуль з малой літары. Відаць, адпаведнае распараджэнне там яшчэ не атрымалі.

Цікава, а якія меры ўздзеяння знойдуць лукашэнкаўскія чыноўнікі на расійскіх журналістаў? Яны ж, нават калі гаворка ідзе аб прэзідэнце Ельцыне, слова "прэзідэнт" пішуць з малой літары.

Мікола ГРЫНЯВІЦКІ.

Джордж, я пропил твои деньги

Обозреватель "Свабоды" побывал у следователя

В Беларуси множатся уголовные дела. Одно из них — дело фонда Сороса — может стать прецедентом уголовного преследования очень широкого круга лиц.

Если помните, Белорусский фонд Сороса был обвинен властями в сокрытии доходов от налогообложения. Известный капиталист и филантроп, которого на родине в Венгрии звали Дьордь Сорош, а в Америке стали величать Джорджем Соросом, счел это для себя оскорбительным и прекратил осуществление гуманитарных программ в Беларуси. Проще говоря, хлопнул дверью.

На память г-ну Соросу остался подписанный лично Лукашенко экземпляр белорусской Конституции, белорусам — их традиционные проблемы, а также вновь приобретенные. Поскольку против БФС возбуждено уголовное дело, то под подозрение попали все грантополучатели. Подобно тому, как хозяйка вырывает из грядки редиску на салат, следственные органы методично вызывают получивших копейку от Сороса и требуют отчитаться: куда ушли капиталистические деньги.

Неважно, что на сей счет существуют бухгалтерские документы, в качестве свидетелей вызывают всех или почти всех. На днях вызвали и меня. Дело в том, что в мае прошлого года, когда БФС подводил итоги конкурса "Лучший экономический обозреватель", жюри неожиданно для меня (никаких заявок я не подавал), присудило мне премию по стихийно сформулированной номинации — "читательские симпатии". Не скрою, элемент неожиданности доставил мне тогда немало приятных минут.

Чего нельзя было сказать о размере премии-гранта — всего 250 долларов США. Она могла бы быть гораздо больше, сумма явно не соотвествовала уровню моего самомнения. К тому же творчество (пусть это всего лишь популяризация экономической политики) — процесс индивидуальный, но результаты его принадлежат всем. Поэтому процесс поедания "зелени" начался еще до получения ее в банке. Поздравляли коллеги и родственники, звонили друзья и знакомые: все предлагали себя в качестве бескорыстных воспевателей моих публицистических заслуг. Короче, деньги Джорджа мы пропили. Тем более что выданы они были мне "для индивидуальной финансовой поддержки".

Так что, не имея греха перед белорусскими властями (пили ведь не самогон, а легальную подакцизную продукцию), я винюсь перед американским миллиардером: Джордж, я пропил твои деньги. Заодно хочу заблаговременно предупредить всех внутри страны и за рубежом: такая же участь постигнет и Нобелевскую премию, которая вполне соответствует уровню моего самомнения и будет принята с благодарностью.

Конечно же, я благодарен г-ну Соросу: начинал он свои программы в нормальной стране, а завершал работу, образно говоря, в сумасшедшем доме. И его вины в случившемся нет.

Константин СКУРАТОВИЧ.

Абаронцы правоў чалавека — абаронцы "Свабоды"

Да цэлага шэрагу пратэстаў супраць закрыцця "Свабоды" далучыўся і Міжнародны Хельсінкскі камітэт па правах чалавека Human Rights Watch/Helsinki.

Праваабаронцы патрабуюць неадкладна аднавіць рэгістрацыйнае пасведчанне "Свабоды", каб газета магла зноў выходзіць. Міжнародны камітэт падкрэслівае, што беларускія ўлады павінны паважаць замацаванае ў Канстытуцыі права на свабоду слова. "Неабходна прыняць меры, каб забяспечыць адпаведныя ўмовы для паспяховага існавання незалежных сродкаў масавай інфармацыі — без уладавых умяшальніцтваў, ціску і цэнзуры", — піша ў звароце да Лукашэнкі выканаўчы дырэктар Міжнароднага Хельсінкскага камітэта Холі Картнер.

Камітэт таксама настойвае на стварэнні спецыяльнай камісіі з удзелам замежных экспертаў у галіне свабоды прэсы, каб усе рашэнні судовай і выканаўчай улад па сродках масавай інфармацыі прымаліся з улікам адпаведных міжнародных стандартаў.

Расціслаў ПЕРМЯКОЎ.

Увага! Конкурс

Хто ў Беларусі будзе наступным лаўрэатам прэміі Генры Форда?

Дабрачынны фонд "Еўрапейская прэмія Генры Форда за захаванне культурнай спадчыны і навакольнага асяроддзя" зноў аб'яўляе ў 34 краінах свету конкурс на лепшы праект і запрашае да ўдзелу ў ім вучоных, спецыялістаў. Праграма конкурсу складаецца з чатырох раздзелаў: прыроднае асяроддзе, культурная спадчына, інжынерна-канструктарскія распрацоўкі па зніжэнні аб'ёмаў выкарыстання карысных выкапняў, маладзёжныя праекты.

Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў прэс-службе сумеснага прадпрыемства "Форд Юніян", супрацоўнікі якой упаўнаважаны быць арганізатарамі ўдзелу ў конкурсе прадстаўнікоў з Беларусі, лепшаму праекту назначана прэмія ў 2500 долараў і так званая "Нацыянальная ўзнагарода".

Дарэчы, гэта ўжо другое запрашэнне ад дабрачыннага фонду "Еўрапейская прэмія Генры Форда за захаванне культурнай спадчыны і навакольнага асяроддзя" на ўдзел у такім прэстыжным конкурсе для грамадзян Беларусі. Першы раз, а было гэта ў пачатку гэтага года, пераможцам у ім выйшаў навуковы супрацоўнік Нацыянальнай акадэміі навук Пётр Козла са сваім праектам "Захаванне і абарона белавежскіх зуброў".

Таццяна СМІРНОВА.
БелТА.

Крымінал

Чуткі аб маньяку не пацвердзіліся, але палачанам ад гэтага не стала лягчэй

Чуткі аб тым, што ў Полацку з'явіўся маньяк-забойца, абвергнуў мясцовы райаддзел унутраных спраў. Аднак для жыхароў горада гэта не можа быць суцяшэннем, паколькі ўчыненыя тут забойствы не раскрыты, а больш дакладна, не знойдзены віноўнік.

Па-ранейшаму не вядомы забойца 26-гадовай палачанкі, паўаголены труп якой быў нядаўна знойдзены недалёка ад ракі Палата. Безвыніковым застаецца і расследаванне забойстваў яшчэ дзвюх жанчын. Цела адной з іх знойдзена ў Задзвінні, другой — каля дарогі Віцебск—Рыга. У горадзе не раскрыта таксама пяць згвалтаванняў, учыненых у мінулым годзе. А колькасць забойстваў у гэтым годзе вырасла ў параўнанні з мінулым годам з 10 да 12.

Хоць супрацоўнікі міліцыі і не лічаць нераскрытыя справы беспаспяховымі і настойліва працягваюць расследаванне, апасенні палачан, і асабліва палачанак, можна зразумець.

Вольга СІДАРОВІЧ,
БелТА.

Крик души

Моя единственная мечта — пианино

Здравствуйте, дорогая редакция!

Пишет Вам обыкновенная девчонка. Я учусь в восьмом классе и уже не верю в то, что на свете есть справедливость, честность. Для меня это все потерянные слова.

Когда мне было шесть лет, многие советовали моей маме отдать меня в музыкальную школу. Но мама не захотела этого, потому что музыкальная школа находилась далеко от нашего дома. С тех пор я и учусь в обычной средней школе №90. Уроки музыки в ней проходят раз в неделю.

Однажды мама все-таки решила отвести меня в школу с музыкальным уклоном. Руководитель школы прослушал меня и сказал, что голос у меня хороший, но я не могу учиться в этой школе, потому что живу в другом районе.

Моя единственная мечта — пианино. Каждый день я прошу маму купить мне его. Моя мама — учитель математики, и естественно, что с ее зарплатой на пианино не заработаешь. Недавно я вместе со своей подругой решила накопить денег и купить музыкальную технику. Мы уже сочинили очень много песен — целую тетрадь. Но я уже потеряла надежду на то, что когда-нибудь мои мечты осуществятся.

Однажды меня пригласили на конкурс "Усе мы родам з дзяцінства". Я пришла на репетицию. Руководитель стала перечислять список выступающих, но меня в нем не оказалось. Я спросила, почему нет в списке моей школы. Руководитель грубо мне ответила: "Где ты была, когда мы репетировали в прошлый раз?" Мои глаза сразу наполнились слезами. Разве хоть кто-нибудь мне сообщил об этом? Прошло время. Я каждый день жду, надеюсь, что мне хоть кто-нибудь позвонит.

